Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (100), 2017

*УДК 821.161.3.0*

# Канцэптавая тапаграфія найноўшай беларускай літаратуры

І.Л. Шаўлякова-Барзенка

Канцэптавая тапаграфія беларускай літаратуры пачатку XXI ст. у спецыфічнай праекцыі аднаўляе контуры нацыянальнай культуры як культуры аўтэнтычнай *беларушчыны*. Канцэптасфера літаратуры разглядаецца як складанаарганізаваная сістэма; яе ўтварае рухомая іерархізаваная цэласнасць універсальных (агульнанацыянальных, гісторыка-культурных) і індывідуальна-аўтарскіх канцэптаў. Структураўтваральную ролю ў канцэптасферы найноўшай беларускай літаратуры выконваюць паняцці '*памежжа', 'мова', 'скрыжаванне', 'вяртанне', 'самота'* і некаторыя іншыя. Трансфармацыі канцэптасферы абумоўліваюць акрамя іншага вектар выхаду мастацкіх ідэй у сацыякультурны кантэкст.
**Ключавыя словы:** найноўшая беларуская літаратура, канцэпт, канцэптасфера, рэміфалагізацыя, беларушчына.

The conceptual topography of the Belarusian literature at the beginning 20th century restores the contours of the national culture in particular projection as a culture of authentic *belaruščyna*. It is suggested to consider the literature concepts-sphere as a difficult organized system. It is a hierarchical integrity of concepts such as universal (nationwide, historical-and-cultural) and individual (author's). '*Pamiežža*' (borderlands), '*mova*' (mother tongue), '*viartańńe'* (returning), '*samota*' (anguish) and some other concepts are structure-forming for the latest Belarusian literature. Transformations of the concept-sphere determine the implementation of art ideas in the cultural context.
**Keywords:** latest Belarusian literature, concept, concepts-sphere, remythologization, belaruščyna.

**Уводзіны.** Найноўшая літаратура (у беларускай культурнай прасторы храналагічна атаясамліваецца з мастацкай славеснасцю апошняга дзесяцігоддзя XX ст. – пачаткам XXI ст.) з'яўляецца складаным і разам з тым надзвычай актуальным аб'ектам тэарэтычнага асэнсавання.

З аднаго боку, найноўшая літаратура ёсць феноменам па вызначэнні рухомым, у чымсьці нават супярэчлівым. Для сучасніка яна ў любы момант назірання знаходзіцца ў своеасаблівай кропцы біфуркацыі, адкуль літаратурная гісторыя патэнцыяльна можа рушыць у самым непрадказальным кірунку. Усё гэта відавочна ўскладняе задачы, звязаныя з выяўленнем і апісаннем з'яў і працэсаў сутнасных, напрыклад, заканамернасцей і перспектыў развіцця нацыянальнай літаратуры ў новай інфармацыйнай рэальнасці).

З другога боку, парадыгмальны характар змен у сацыякультурнай прасторы памежжа XX–XXI стст. абумоўлівае важнасць аператыўнага, амаль «сінхроннага» тэарэтычнага асэнсавання з'яў і падзей найноўшай літаратуры. Для беларускага гуманітарнага дыскурсу канцэптуальны (з элементамі прагнастычнага мадэлявання) аналіз бягучага літаратурнага працэсу набывае асаблівую актуальнасць – у сувязі з адметнай роляй прыгожага пісьменства ў станаўленні і развіцці нацыянальнай культуры.

Адной з тэндэнцый развіцця беларускай літаратуры ў пачатку XXI ст. з'яўляецца актывізацыя працэсаў мастацкай (сама)ідэнтыфікацыі [1]. Калі 1990-я гг. беларускае літаратуразнаўства сустрэла ў пэўнай метадалагічнай разгубленасці, то ў 2010-х гг. некаторыя айчынныя даследчыкі канстатуюць своеасаблівае метадалагічнае бяссілле сучаснай беларускай тэорыі літаратуры [2, с. 7].

Не падзяляючы катэгарычнасці такіх ацэнак, звернем увагу на абвостранасць адчування пэўнага камунікацыйнага разрыву паміж літаратурна-мастацкімі практыкамі і іх тэарэтычным асэнсаваннем. Інакш кажучы, размова ідзе пра неабходнасць выпрацоўкі такой метамовы, якая дазволіла б беларускім літаратуразнаўцам адэкватна апісаць сутнасць з'яў найноўшай мастацкай славеснасці. Выдатныя магчымасці для выпрацоўкі такой метамовы ўтрымлівае, на наш погляд, распрацоўка тэарэтычных асноў літаратурнай канцэпталогіі.

**Асноўная частка**. З часу ўвядзення ў другой палове 1920-х гг. паняцця *'канцэпт'* ва ўжытак айчынных даследчыкаў літаратуразнаўства выяўляла да яго відавочна меншы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інтарэс, чым, напрыклад, лінгвістыка. З 1990-х гг. (калі на постсавецкай прасторы заўважна актывізаваліся розныя школы лінгвістычнай канцэпталогіі) даследчыкі літаратуры аддавалі перавагу, як правіла, вывучэнню мастацкіх канцэптаў на матэрыяле асобных твораў альбо (радзей) апісанню паўтаральных (матыўных) літаратурна-мастацкіх з'яў, а таксама канцэптасфер творчасці асобных пісьменнікаў (згадаем, напрыклад, манаграфію расійскага даследчыка В. Маславай «Поэт и культура: концептосфера Марины Цветаевой», 2004). У беларускім гуманітарным дыскурсе 1900-х – 2000-х гг. увага скіроўвалася на тэарэтычнае асэнсаванне паняццяў *архетып* і *міфалагема*, а таксама аналіз іх увасаблення ў творах нацыянальнай літаратуры розных гісторыка-літаратурных эпох (артыкулы У. Конана, І. Чароты, В. Акудовіча, Т. Шамякінай і інш.). Пры гэтым у сярэдзіне 2010-х гг. у беларускім літаратуразнаўстве «тэарэтычныя асновы канцэптуальнага аналізу мастацкага тэксту застаюцца непрапрацаванымі» [3]. Асобныя арыгінальныя даследаванні беларускіх літаратуразнаўцаў (вывучэнне вытокаў нацыянальнай канцэпталогіі А. Рагулем, спроба Ю. Масарэнкі рэалізаваць канцэпталагічны падыход падчас ідэйна-эстэтычнага аналізу беларускай лірычнай прозы [4]) сітуацыю пакуль істотна не выпраўляюць.

Між тым, магчымасць прадстаўлення верагоднаснага мадэльнага бачання найноўшай літаратуры (з улікам яе параметраў як прынцыпова незавяршальнага праекта) мы звязваем з рознаўзроўневым апісаннем яе канцэптасферы. Зварот да метадалагічных ідэй сінергетыкі, семіётыкі, структурна-функцыянальнага аналізу і тэзаўруснага падыходу, на нашу думку, дазволіць акрэсліць ключавыя кампаненты канцэптасферы нацыянальнага мастацтва слова, што абумоўліваюць асаблівасці падсістэм літаратуры (аксіялагічнай, эстэтычнай, стылявой) як складанаарганізаванай цэласнасці.

Рэакцыяй на крызіс ідэнтычнасці сучаснай беларускай літаратуры ў апошняй чвэрці XX ст. сталі працэсы яе мастацкай (сама)ідэнтыфікацыі. Наступствы гэтага на розных узроўнях мастацкай літаратуры як сістэмы выяўляюцца з рознай інтэнсіўнасцю. Так, структурныя і зместавыя трансфармацыі канцэптасферы нацыянальнай літаратуры праз тры дзесяцігоддзі (з другой паловы 1980-х да сярэдзіны 2010-х гг.) заўважныя ўжо зараз. *Канцэптасферу літаратуры* мы разглядаем як *складанаарганізаваную сістэму, здольную да самаразвіцця; яе ўтварае рухомая іерахічная цэласнасць універсальных і індывідуальна-аўтарскіх канцэптаў*. Сярод *універсальных літаратурна-мастацкіх канцэптаў* мы прапануем адрозніваць *агульнанацыянальныя і гісторыка-культурныя*. Згаданыя тыпы канцэптаў, відавочна дыферэнцыруюцца паводле «межаў універсальнасці». Аднак варта браць пад увагу прынцыповую ўнутраную дынамічнасць канцэптасферы літаратуры, што ў ліку іншага абумоўлівае патэнцыяльную магчымасць руху індывідуальна-аўтарскага канцэпту па іерархічнай лесвіцы, то бок ператварэння яго ў гісторыка-культурны, а з цягам часу (гіпатэтычна) – у агульнанацыянальны.

З прычыны ўсведамлення складанасці (шматкампанентнасці і шматузроўневасці) канцэптасферы нацыянальнай літаратуры ў межах гэтага артыкула мы аддаем перавагу паняццю *канцэптавай тапаграфіі* (яно хутчэй аказіянальнае, чым строга-тэрміналагічнае). Яе прапануецца разглядаць як своеасаблівую матрыцу альбо контурную карту канцэптасферы. Паводле канцэптавай тапаграфіі можна скласці ўяўленні пра:

– умоўную наменклатуру канцэптаў, найбольш запатрабаваных (актуалізаваных) у літаратурна-мастацкай прасторы пэўнага перыяду;

– іерархічны статус таго ці іншага канцэпту (прыналежнасць да пэўнага тыпу і ўзроўню не толькі канцэптасферы літаратуры, але і – у шэрагу выпадкаў – нацыянальнай культуры ў цэлым);

– матыўную структуру літаратуры адпаведнага перыяду[1];

– трансфармацыйныя працэсы ўнутры канцэптасферы літаратуры пэўнага перыяду.

Канцэптавая тапаграфія беларускай літаратуры пачатку XXI ст. у спецыфічнай праекцыі аднаўляе своеасаблівую контурную карту нацыянальнай культуры як культуры

[1] Канцэпты аб'ектывуюцца ў сістэме матываў; інакш кажучы, «матыў часта не толькі выступае ў ролі асноўнага рэпрэзентанта мастацкага канцэпта, але і з'яўляецца "ачагом інтэртэкстуальнасці", у другой сваёй функцыі звязвае індывідуальна-аўтарскую канцэптасферу з канцэптасферай культуры» [3]).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

аўтэнтычнай *беларушчыны*. (У дадзеным выпадку азначэнне «аўтэнтычная» ўказвае на адпрэчванне любой «эрзацавасці».) *Беларушчына* ў межах найноўшай літаратуры набывае статус гісторыка-культурнага канцэпту, які па меры руху ад другой паловы 1980-х да сярэдзіны 2010-х гадоў набывае статус ядровага паняцця.

Структураўтваральна-каркасную ролю ў канцэптавай тапаграфіі найноўшай беларускай літаратуры выконваюць паняцці *‘памежжа’, ‘мова’, ‘скрыжаванне’, ‘вяртанне’, ‘тутэйшасць’, ‘чужынства’, ‘самота’, ‘псеўда’* і некаторыя іншыя. Тыпалагічна належачы да розных іерархічных узроўняў канцэптасферы літаратуры, яны знаходзяцца ў складаным узаемадзеянні, а таксама вызначаюцца ўнутранай рухомасцю. Урэчаўленне канцэптаў у мастацкіх творах адбываецца на розных узроўнях: моўна-выяўленчым, матыўна-вобразным, ідэйна-каштоўнасным. Адметнасцю найноўшай беларускай літаратуры з’яўляецца стылявая разнастайнасць увасабленняў аднаго і таго ж канцэпту.

Разглядаючы стасункі паняццяў «нацыянальны культурны свет» і «нацыянальная канцэптасфера», В. Зусман і З. Кірнозе падкрэсліваюць, што «канцэпт заўсёды мае патрэбу ў інтэрпрэтацыі, бо ў ім спалучаны паняцці і ўяўленні, стандартызаванасць і ўнікальнасць”, пры гэтым “нацыянальныя канцэпты, як і нацыянальныя канцэптасферы не могуць быць дакладна атрыбутаваны (вызначаны), але могуць быць апісаны» [5].

На наш погляд, найбольш складанымі для інтэрпрэтацыі (у тым ліку – для своеасаблівага “перакладу” сімвалічнай сутнасці канцэпту на мовы іншых нацыянальных культур) у найноўшай беларускай літаратуры з’яўляюцца канцэпты гісторыка-культурныя, бо тут унікальнае пераважае стандартызаванае. Бадай, самы яскравы аргумент на карысць гэтага – канцэпт *‘тутэйшасць’*. Вытокі гэтага канцэпта, які з другой паловы 1980-х стаўся прадметам літаратурнага і грамадскага абмеркавання, звязаны з п’есай Янкі Купалы «Тутэйшыя» (1922). У межах апошніх трыццаці год назіраецца ператварэнне індывідуальна-творчага канцэпту *‘тутэйшы(я)’* ў гісторыка-культурны канцэпт *‘тутэйшасць’*, які ў дыскурсе XXI ст. набывае вагу канцэпту гісторыка-культурнага. *‘Тутэйшасць’* утрымлівае інварыянтныя прыкметы (ментальная прырода, моўнае выражэнне і сацыякультурная абумоўленасць), а таксама абавязковыя структурныя элементы (паняційны, вобразны і каштоўнасны, з дамінаваннем апошняга) канцэпту. А. Пяршай на аснове аналізу меркаванняў айчынных і замежных гісторыкаў, філосафаў, культуролагаў, палітолагаў, фармулюе погляд на *тутэйшасць* як на іншую форму нацыянальнай ідэнтычнасці, якая «ўказвае не на “дакладнасць” вызначэння і пазнавання нацыі, а на сувязь прадстаўнікоў гэтай нацыі з іх “геаграфіяй” – унікальным спалучэннем гістарычных, сацыякультурных і палітычных абставін, што вызначаюць лад рэчаў у канкрэтным рэгіёнё» [6, с. 267].

На адрозненне ад гісторыка-культурных канцэптаў індывідуальна-творчыя канцэпты ў найноўшай беларускай літаратуры выражаюцца ў сэнсаформах, дзе агульнае (глабальнае) пераважае адметнае (лакальнае), то бок мастацкі канцэпт лёгка “перакладаецца” з адной культурнай мовы на іншую як сацыякультурнае паняцце. Згадаем, напрыклад, пра вагу канцэпту «псеўды» ў прасторы «клінічнага пострэалізму» Ю. Станкевіча, альбо аўтарскую версію канцэпту ў «бязлітасна-рэалістычнай» прозе А. Брава: «…засноўваць што б там ні было на той псеўдарэальнасці, якая раілася навокал, я не жадала. Усе каштоўнасці гэтага свету былі мёртвыя, нібы праспіртаваныя вантробы ў слоіках, якія грувасціліся на стэлажах кафедры хірургіі, куды нас ганялі адпрацоўваць “ваенку”. <…> Свет, у якім былі абавязаны стаць шчаслівымі, быў забруджаны крывадушнасцю, як радыяцыяй. І мне любой цаной хацелася здзерці абрыдлую маску, нават калі б дзеля гэтага спатрэбілася сарваць з сябе і самую скуру» [7, с. 13].

Адметным кампанентам канцэптавай тапаграфіі найноўшай беларускай літаратуры з’яўляюцца індывідуальна-аўтарскія інтэрпрэтацыі агульнанацыянальных канцэптаў. Так, вобраз-сімвал сфагнума з аднайменнага рамана В. Марціновіча («Сфагнум», 2013) генетычна звязаны з канцэптам *‘балота’*; многія персанажы «Сфагнума» ўспрымаюцца як найноўшыя версіі канцэпту *‘тутэйшы(я)’*. Аўтар у шэрагу інтэрв’ю рашуча адпрэчвае сувязь праблематыкі рамана з балотам як адным з ядровых паняццяў для нацыянальнай канцэптасферы: В. Марціновіч настойвае на тым, што «Сфагнум» – раман не пра балота, а

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

пра абсурд існавання. Аднак у рэцэпцыі беларускага чытача і рускамоўная, і беларускамоўная (перакладная) версіі твора цесна (генетычна) паяднаныя з, так бы мовіць, культуралогіяй *'балота'*. Індывідуальна-аўтарскі характар мастацкім вобразам, праз якія "прамаўляецца" канцэпт у тэксце, надае татальная іронія аповеду, выкананага ў тэхніцы літаратурнага трэшу. Тыпалагічна падобная сітуацыя назіраецца яшчэ ў адным рамане В. Марціновіча "Мова" (2014). Агульнанацыянальны канцэпт *'мова'* ў жанравай прасторы антыўтопіі скарыстоўваецца аўтарам як будаўнічы матэрыял новай міфалогіі. Адпаведна, матэрыялізуецца агульнанацыянальны канцэпт у матыве мовы як наркотыка, мовы як таямніцы, толькі таямніцы не сакральнай, а трэшавай. Менавіта вакол *'мовы'* В. Марціновіч у згаданым творы выштукоўвае сваю індывідуальна-аўтарскую міфалогію, якую паводле сутнасных адзнак можна ўмоўна акрэсліць як "кібер-ганста-міфалогію", замешаную на эрзац-уяўленнях пра *беларушчыну*.

**Заключэнне.** Назіранні за рухомымі контурамі канцэптавай тапаграфіі найноўшай літаратуры дазваляюць зрабіць шэраг прамежкавых высноў.

1) Канцэптасфера найноўшай беларускай літаратуры цэнтраваная на *беларушчыне (*у гэтым сэнсе яна перадусім *"беларушчына-цэнтрычная")*, пры гэтым, напрыклад, *'літаратура'* і *'мова'* маюць статус роўнавялікіх універсальных (агульнанацыянальных) канцэптаў.

2) У літаратурнай прасторы канца XX – пачатку XXI стст. найбольш выразныя трансфармацыі адбываюцца з гісторыка-культурнымі канцэптамі. Гэта тлумачыцца як фактарамі пазалітаратурнымі (напрыклад, вектары развіцця інфармацыйнага грамадства, змены культурных парадыгм і г. д.), так і ўнутрылітаратурнымі (актуалізацыя працэсаў мастацкай (сама)ідэнтыфікацыі як адзнака станаўлення новага тыпу творчасці і інш.).

3) Індывідуальна-аўтарскія канцэпты генетычна звязаны з універсальнымі (гісторыка-культурнымі і агульнанацыянальнымі) канцэптамі; даволі часта гэта сувязь носіць маніфестацыйны (падкрэслены) характар.

4) Выяўленне канцэптаў на ўзроўні матываў у цэлым адбываецца ў рэчышчы традыцыйным і па выніку складваецца ў метаматыў пошукаў ідэнтычнасці (асбаснай, культурнай, нацыянальнай). Пры гэтым вобразна-мастацкія ўвасабленні канцэптаў агулам пакідаюць уражанне стракатасці, калі на роўнай адлегласці ад цэнтру аказваюцца рэчы рознафарматныя, рознавартасныя ў эстэтычных і мастацкіх адносінах.

У мастацкім свеце найноўшай літаратуры цесна пераплятаюцца катастрафізм светаадчування і спецыфічна беларускі аптымізм, узнёслая героіка і трагічная самота, экзістэнцыйная бязлітаснасць і шчымліва-пранізлівы экзістэнцыяльны лірызм. Паводле канцэптавай тапаграфіі найноўшай беларускай літаратуры можна скласці даволі поўнае ўяўленне пра спецыфіку, тэндэнцыі і найбольш верагодныя вектары развіцця канцэптасферы літаратуры ў цэлым.

Калі вывучэнне канцэптасферы твора дазваляе сучасным літаратуразнаўцам «выявіць усю складанасць гісторыка-літаратурных і культурных сувязей, якія ўтвараюць інтэртэкстуальнае поле мастацкай прасторы» [3], то вывучэнне канцэптасферы нацыянальнай літаратуры ў так званай рэтраперспектыве (г. зн. у гісторыка-культурнай дынаміцы з магчымымі выхадамі ў прагнастычнае мадэляванне), на наш погляд, спрыяе выяўленню найбольш важных заканамернасцей агульналітаратурнага развіцця.

Трансфармацыі канцэптасферы абумоўліваюць не толькі змены на ўсіх узроўнях найноўшага прыгожага пісьменства як мастацкай сістэмы, але і вектар выхаду мастацкіх ідэй у сацыякультурны кантэкст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Літаратура**

1. Шаўлякова-Барзенка, І.Л. Мастацкая (сама)ідэнтыфікацыя: тэарэтычная легітымацыя паняцця ў кантэксце развіцця найноўшай беларускай літаратуры / І.Л. Шаўлякова-Барзенка // Труды БГТУ. Сер. История, философия, филология. – 2014. – № 5 (169). – С. 135–139.

2. Тычына, М.А. Уводзіны / М.А. Тычына // Міждысцыплінарныя даследаванні актуальных праблем тэорыі літаратуры / М.А. Тычына [і інш.] ; навук. рэд. М.А. Тычына ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 3–9.

3. Волкова, В.Б. Концептосфера современной военной прозы : дис. … докт. филол. наук : 10.01.01 / В.Б. Волкова [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.dslib.net/russkaja-literatura/konceptosfera-sovremennoj-voennoj-prozy.html. – Дата доступа : 25.03.2016.

4. Масарэнка, Ю.А. Канцэпталогія ў даследаванні беларускай лірычнай прозы / Ю.А. Масарэнка // Міждысцыплінарныя даследаванні актуальных праблем тэорыі літаратуры / М.А. Тычына [і інш.] ; навук. рэд. М.А. Тычына ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 323–374.

5. Зусман, В.Г. Национальная концептосфера и политическая нация / В.Г Зусман, З.И. Кирнозе [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://publications.hse.ru/chapters/64467631. – Дата доступа : 10.02. 2016.

6. Першай, А. Тутэйшасць как тактика культурного сопротивления: о локальности, социальной мобильности и беларусской национальной идентичности / А. Першай // Форум новейшей восточноевропейской истории и культуры. – 2012. – № 2. – С. 251–268.

7. Брава, А. Каменданцкі час для ластавак: Аповесці, апавяданні / А. Брава. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – 183 с.

Научно-методическое учреждение
«Национальный институт образования»
Министерства образования Республики Беларусь

Поступила в редакцию 20.03.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ